УДК 930 (476)+357.71

**Шаўчук І.І.**, доктар гістарычных навук, прафесар кафедры гісторыі славянскіх народаў
Беларусь, Брэст, БрДУ
**Карзенка Г.У.**, доктар гістарычных навук, загадчык кафедры паліталогіі і права
Беларусь, Мінск, БДПУ імя Максіма Танка

## ПАЧАТАК ІНСТЫТУАЛІЗАЦЫІ ГІСТОРЫКА-НАВУКОВЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ У НАН БЕЛАРУСІ

Спробы інстытуалізацыі гісторыка-навуковых даследаванняў у найноўшы час у БССР адзначаюцца яшчэ ў другой палове 1920-х гадоў. Менавіта тады мелася магчымасць надаць гісторыка-навуковым даследаванням сістэматычны арганізаваны характар. Аб гэтым сведчыць прапанова загадчыка кафедры тэхнічнай матэматыкі і яе методыкі Вышэйшых педагагічных курсаў у Ленінградзе Вацлава Рамуальдавіча Мрочака. Звяртаючыся да кіраўніцтва Інстытута беларускай культуры (ІБК) у чэрвені 1928 г., ён пісаў: “Больш за ўсё мяне б задаволіла даручэнне арганізаваць у ІБК секцыю гісторыі і метадалогіі навук і тэхнікі; зразумела, я бы прыцягнуў да гэтай працы і сваіх ленінградскіх калег” [17, арк. 88]. Аднак гэтая перспектыўная прапанова не была рэалізаваная.

Разам з тым яшчэ ў 1920-х гадах праявілася разуменне неабходнасці вывучэння гісторыі навукі ў Беларусі як каталізатара іх развіцця. Так, у 1926 г. пабачыла свет кніга “Інстытут Беларускае Культуры (Інбелкульт)”, падрыхтаваная Аляксандрам Іванавічам Цвікевічам [9]. Зафіксавана нерэалізаваная спроба ажыццявіць чарговае выданне, якое б асвятляла асноўныя этапы развіцця ІБК. Прэзідыум Акадэміі ў красавіку 1929 г., абмеркаваўшы праспект, пастанавіў падрыхтаваць манаграфічную працу на гэтую тэму. Для выканання задання ён стварыў камісію пад кіраўніцтвам Вацлава Юстынавіча Ластоўскага ў складзе Мікалая Ільіча Бялугі, Сцяпана Міхайлавіча Некрашэвіча і Аркадзя Антонавіча Смоліча [24, арк. 38]. Яе дзейнасць была спынена арыштамі трох членаў у 1930 г. Безумоўнай увагі заслугоўвае фундаментальная праца А.І. Цвікевіча “Западно-руссизм”. З гісторыі грамадскай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в.” (Мінск, 1993). У першай палове 1930-х гадоў з’явіліся дзве публікацыі, якія, нягледзячы на своеасаблівы палітыка-ідэалагічны кантэкст, утрымліваюць багатую канкрэтна-гістарычную інфармацыю па мінуламу і сучаснаму стану Інстытута беларускай культуры і Беларускай акадэміі навук [43; 44]. Убачыў свет шэраг змястоўных артыкулаў Васіля Карпавіча Шчарбакова [45; 46] і інш.

Пазней, ужо ў 1947 г., у зборніку, прысвечанаму Акадэміям навук саюзных рэспублік, змешчаны вялікі артыкул тагачаснага прэзідэнта АН БССР Мікалая Іванавіча Грашчанкава [4]. У 1957 г. пабачыла свет гісторыя Акадэміі пад аўтарствам Васіля Феафілавіча Купрэвіча (у 1958 і 1968 гг. ажыццёўлены другое і трэцяе выданні) [10; 11; 12]. Стварэнне яе гісторыі ў новых грамадска-

палітычных варунках абумоўлівалася, магчыма, неабходнасцю даць сваю інтэрпрэтацыю мінулага ўстановы, паколькі ў эміграцыі беларусамі здзейснена падобнае даследаванне [18][1].

Пачатак 1970-х гадоў з'яўляецца адметным для беларускай навукі. Адметнасць гэта бачыцца ў тым, што менавіта тады ўпершыню не толькі ў Акадэміі, але і ва ўсім навуковым комплексе рэспублікі закладзены арганізацыйныя падмуркі комплекснага вывучэння гісторыка-навуковай праблематыкі.

Прапрацоўвацца зазначанае пытанне стала з пачатку 1972 г. 23 лютага бюро Аддзялення грамадскіх навук (АГН) даручыла дырэктару Інстытута гісторыі, члену-карэспандэнту АН БССР Іларыёну Мяфодзьевічу Ігнаценку да 10 сакавіка ўнесці прапановы пра магчымасць напісання "навуковай гісторыі АН БССР" [42, арк. 12]. На працягу месяца адбылася яго размова з прэзідэнтам Акадэміі М.А. Барысевічам, пасля чаго бюро АГН 22 сакавіка прыняло рашэнне вярнуцца да абмеркавання напісання гісторыі Акадэміі навук пазней [42, арк. 13, 14]. За 1972 г. усе прынцыповыя моманты па стварэнні структурнай адзінкі для выканання пастаўленай задачы былі вырашаныя, і 12 снежня таго ж году бюро Прэзідыума АН БССР пастанавіла стварыць у складзе Інстытута гісторыі групу па вывучэнню гісторыі навукі.

Адпаведна 29 студзеня 1973 г. адбылося паседжанне Вучонай рады інстытута, на якім у план навукова-даследчай тэматыкі ўстановы ўключана напісанне "Гісторыі Акадэміі навук Беларускай ССР". У той самы дзень выдадзены загад № 20 аб стварэнні групы па вывучэнні гісторыі навукі. Першымі яе супрацоўнікамі (на працягу 1973 г.) сталі намеснік дырэктара інстытута па навуковай працы, доктар гістарычных навук П.Ц. Петрыкаў (кіраўнік), кандыдат гістарычных навук, старшы навуковы супрацоўнік М.І. Галенчык (у 1971 г. ім абаронена кандыдацкая дысертацыя "Подготовка научных кадров в Белорусской ССР и их творческий вклад в развитие науки (1943–1965 гг.)"), малодшы навуковы супрацоўнік Яўген Іванавіч Калеснік (у лістападзе абараніў кандыдацкую дысертацыю "Деятельность Компартии Белоруссии по ускорению технического прогресса в промышленности республики (1956–1961 гг.)"), старшыя лабаранты Людміла Уладзіміраўна Калядзінская (з лютага 1974 г. – малодшы навуковы супрацоўнік), Алег Уладзіміравіч Лібезін (з чэрвеня 1973 г. – малодшы навуковы супрацоўнік), Галіна Міхайлаўна Ганжа, Марыя Трыфанаўна Чарнова, машыністка Людміла Мікалаеўна Дзіцэвіч. Такім чынам, да восені ў асноўным сфарміраваўся склад групы [25, арк. 26, 27, 32, 92, 148; 26, арк. 56].

Зразумела, на працягу ўсяго перыяду яе існавання (29.01.1973 г. – 10.04.1980 г.) адбываліся перыядычныя змены ў кадравым складзе пры тым, што паступова фарміравалася "ядро" навуковых супрацоўнікаў, якія неслі на сябе асноўную навукова-даследчую нагрузку ў адпаведнай галіне. Таму мы коратка

---

[1] Паланевіч Іпаліт (1907–1997). Скончыў Ленінградскі педагагічны інстытут. Рэпрэсаваны, асуджаны на 5 гадоў, пакаранне адбываў ва Ухта-Іжэўскім лагеры. Падчас нямецкай акупацыі – арганізатар беларускага школьніцтва. З лета 1944 г. – у эміграцыі, з 1950 г. – у ЗША. Займаўся даследчыцкай працай.

акрэслім кадравую дынаміку групы ў зазначаны перыяд. На пачатку 1974 г. яе склад папоўніўся старшым навуковым супрацоўнікам Зояй Мікалаеўнай Сарокай (у 1972 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю на тэму "Деятельность общества "Знание" Белорусской ССР по коммунистическому воспитанию трудящихся: 1959–1970 гг."), старшым лабарантам Марынай Дзмітраўнай Цябут (з ліпеня 1975 г. – малодшы навуковы супрацоўнік, памерла ў 1977 г.), з пасады старшага лабаранта на пасаду малодшага навуковага супрацоўніка пераведзены ў групу, як абраны па конкурсе Мікалай Уладзіміравіч Токараў (працаваў у інстытуце з 1968 г.) [29, арк. 18, 20, 43; 31, арк. 168]. Увосень 1975 г. у калектыў групы па вывучэнні гісторыі навукі ўвайшлі старшыя лабаранты Аляксандр Аляксандравіч Лашкевіч (1 верасня), Тамара Пятроўна Бурдун (1 кастрычніка), у 1977 г. – Ірына Сцяпанаўна Гардзеева (1 лістапада).

Кіраўнікі інстытута і групы І.М. Ігнаценка (з 1974 г. акадэмік АН БССР і з 1975 г. дырэктар Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ) і П.Ц. Петрыкаў (у 1975–1988 гг. дырэктар Інстытута гісторыі, з 1977 г. – член-карэспандэнт АН БССР) надавалі шчыльную ўвагу не толькі падбору кадраў, але і іх падрыхтоўцы. Маладыя навуковыя супрацоўнікі і некаторыя лабаранты групы выконвалі навукова-дапаможную працу, прадугледжаную патрэбамі своечасовага выканання асноўнай тэмы – напісанне гісторыі Акадэміі. Адначасова здзяйснялі самастойныя даследаванні, публікавалі ўласныя працы, як правіла, у перыядычным друку. Напрыклад, А.У. Лібезін з ліпеня 1973 г. па кастрычнік 1976 г., за выключэннем навукова-дапаможнай працы па планавай тэме, выпусціў у свет 3 навуковых артыкулы і 4 рэцэнзіі [34, арк. 35]. Малодшы навуковы супрацоўнік М.У. Токараў у 1977–1979 гг. стаў суаўтарам кнігі "Академия наук БССР" [20], дзе ім напісаны тэксты да 1945 г. раздзела "Создание и основные этапы развития Академии наук БССР", прадстаўлена асноўная частка дадаткаў, фотаілюстратыўны матэрыял. У фундаментальную "Академию наук Белорусской ССР" – біяграфіі 9 акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў, якія не былі адлюстраваныя ў БелСЭ. За выключэннем паказанага, М.У. Токараў апублікаваў 5 навуковых артыкулаў (3 друкаваных аркушы) і 5 навукова-папулярных [39, арк. 118, 119].

Разам з тым выкарыстоўваліся і іншыя формы павышэння кваліфікацыі, перадусім – аспірантура. У 1974 г. паступіла на завочную форму навучання Л.У. Калядзінская, у 1975 г. – А.У. Лібезін (кандыдацкая дысертацыя на тэму "Общественно-политическая активность рабочего класса БССР (1966–1970 гг.)" абаронена ў 1981 г.), у 1977 г. – М.У. Токараў [33, арк. 71, 73] (у 1982 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю "Создание и развитие Академии наук Белорусской ССР (1929–1941 гг.)").

Апошняму ў лютым 1976 г. зацверджана была іншая тэма "Фарміраванне навуковай інтэлігенцыі ў перыяд будаўніцтва сацыялізму (1928–1941 гг.)". Для яе раскрыцця аўтар пачаў вывучэнне літаратуры і збор архіўнага матэрыялу [35, арк. 89]. Крыху больш як праз год пасля паступлення ў аспірантуру – у лютым 1978 г. – аспірант-завочнік змяніў меркаванне і прадставіў на суд навукоўцаў Інстытута гісторыі новую тэму сваёй дысертацыі: "Стварэнне і

развіццё Акадэміі навук Беларускай ССР (1929–1941 гг.)". Відавочна, ён меў рацыю, паколькі, працуючы ў групе па вывучэнні гісторыі навукі з 1974 г., назапасіў і пэўны матэрыял, і пэўны вопыт па распрацоўцы асобных пытанняў мінулага АН БССР. Хаця падчас дыскусіі на Вучонай радзе інстытута такімі ўдзельнікамі, як Адам Язэпавіч Залескі (загадчык сектара збору і публікацыі гістарычных дакументаў і мемуараў), Іван Ягоравіч Марчанка (загадчык сектара камуністычнага будаўніцтва), Уладзімір Аляксандравіч Палуян, П.Ц. Петрыкаў (навуковы кіраўнік), Панцеляймон Аляксеевіч Селіванаў (загадчык сектара Кастрычніцкай рэвалюцыі і сацыялістычнага будаўніцтва), выказваліся розныя меркаванні, што ўтрымлівалі сумненні ў правільнасці выбару, было пастаноўлена падтрымаць М.У. Токарава зацвярджэннем яго хадайніцтва [36, арк. 27–28].

Супрацоўнікамі групы ўжо 12 сакавіка 1973 г. быў прадстаўлены для абмеркавання план-праспект тэмы "Гісторыя Акадэміі навук Беларускай ССР". П.Ц. Петрыкаў на пасяджанні Вучонай рады не толькі абгрунтаваў неабходнасць стварэння працы – 50-гадовы юбілей Акадэміі, – але і прадставіў напрацоўкі калектыву па структуры будучай кнігі. Паводле іх яна павінна была складацца з дзвюх частак: заснаванне і развіццё Акадэміі навук і дзейнасць у 1959–1975 гг. Падчас абмеркавання выступілі дзевяць чалавек з канструктыўнымі заўвагамі і прапановамі. Гэта паказвае і зацікаўленнасць супрацоўнікаў інстытута ў паспяховым выкананні дадатковай тэматыкі, і плённую арганізацыю працы навукоўцаў установы, і іх дастаткова шырокі навуковы кругагляд. У прыватнасці, У.А. Палуян прапанаваў свой варыянт з трох частак: першая – даваенны перыяд, другая – 1941–1958 гг., трэцяя – да 1970-х гадоў. Канстанцін Іванавіч Шабуня (загадчык сектара гісторыі Беларусі дасавецкага грамадства) звярнуў увагу на неабходнасць больш шырокага паказу дзейнасці АН БССР у гады вайны і пасля яе, паколькі Акадэмія аднаўлялася да 1950 г., і таму нельга абмяжоўваць аднаўленчы перыяд 1946-м годам.

Пасля дапрацоўкі ў чэрвені на пасяджанне Вучонай рады чарговы раз прадстаўлены варыянт плана будучай манаграфіі з улікам выказаных пажаданняў. І зноў жа адбылося прадуктыўнае абмеркаванне, у якім узялі актыўны ўдзел шэсць супрацоўнікаў інстытута. П.А. Селіванаў звярнуў увагу на неабходнасць напісання асобнага раздзелу "Арганізацыя і дзейнасць Інстытута беларускай культуры". Яго падтрымаў У.А. Палуян, які ў 1972 г. упершыню з пачатку 1930-х гадоў апублікаваў спецыяльны артыкул, прысвечаны гісторыі Інбелкульта [19]. Сяргей Данілавіч Вайтовіч слушна дадаў пра мэтазгоднасць адлюстравання ў калектыўнай манаграфіі новай сферы даследаванняў – знешнія і замежныя сувязі АН БССР [27, арк. 64–66, 178], што было здейснена пры яе выданні.

Адначасова з распрацоўкай плана-праспекта гісторыі Акадэміі, якая ў цэлым была завершана да канца года, праводзіліся пошукі ў архівах і бібліятэках. На падставе сабраных матэрыялаў складзены зводныя даныя пра бюджэт (А.У. Лібезін) і структуру (Я.І. Калеснік), кадравы патэнцыял (Л.У. Калядзінская) АН БССР у розныя перыяды яе існавання, вывучалася літаратура і створана бібліяграфічная картатэка [28, арк. 160].

У 1974 г. нарэшце быў дапрацаваны амаль у канчатковым выглядзе план-праспект даследавання, створана памятка аўтарам па напісанні тэкстаў і фактычна ўкамплектаваны аўтарскі калектыў. Яго члены працягнулі пошукі ў Цэнтральным дзяржаўным архіве Кастрычніцкай рэвалюцыі і сацыялістычнага будаўніцтва БССР (ЦДАКР БССР, фонды СНК, Савета міністраў, Дзяржплана), Архіве АН БССР (фонды Прэзідыума Акадэміі, замежнага аддзелу, зводныя даныя па навуковых кадрах і штатным раскладзе, інфармацыя пра фінансаванне навуковай дзейнасці, структуру АН БССР, пачынаючы з Інбелкульта і да 1970-х гадоў), Партыйным архіве Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ (матэрыялы бюро ЦК КПБ, з'ездаў, пленумаў, канферэнцый па пытаннях навукі і дзейнасці АН БССР с 1929 г. па 1967 г.), архіве Мінскага абкама КПБ (партыйныя дакументы АН БССР за 1944–1970 гг.). Таксама вывучаліся публікацыі перыядычнага друку (газеты і часопісы "Звязда", "Беларусь", "Весці АН БССР", "Коммунист", "Советская Белоруссия" і інш.) [30, арк. 28; 37, арк. 27].

Адным з асноўных выканаўцаў планавых тэмаў групы быў М.І. Галенчык. Таму больш падрабязна спынімся на яго працы, паколькі ў ей яскрава адлюстраваліся асноўныя задачы і накірункі дзейнасці навуковых супрацоўнікаў. Так, толькі ў 1971–1976 гг. Мікалай Іванавіч выконваў планавыя заданні па трох тэмах: 5-томная "Гісторыя Беларускай ССР" (раздзелы "Літаратура, мастацтва і народная творчасць" – у суаўтарстве, 1 д.а., раздзел V; "Узрастанне ролі навукі" – 2 д.а., "Літаратура, мастацтва і народная творчасць" – 1,5 д.а., раздзел XIII); "Братэрскае супрацоўніцтва Беларускай ССР з саюзнымі рэспублікамі" (Мінск, 1974), дзе ім змешчаны "Навуковыя ўзаемасувязі" – 2 д.а. і "Супрацоўніцтва ў галіне літаратуры і мастацтва" (разам з З.М. Сарокай) – 2 д.а.; і трэці – "Гісторыя Акадэміі навук Беларускай ССР". У 1975–1976 гг. даследчыкам прадстаўлены тэксты для гісторыі Акадэміі. У прыватнасці, ім напісаны першы раздзел "Заснаванне Акадэміі навук БССР" (2 д.а.); параграф "Грамадскія навукі" (1 д.а.) для другога раздзела "Асноўныя накірункі і вынікі навуковых даследаванняў у даваенны перыяд"; параграфы "Выдавецкая дзейнасць" (0,5 д.а.) і "Бібліятэка" (0,5 д.а.) у раздзел "Выдавецкая дзейнасць. Бібліятэка. БелСЭ".

Дадаткова да плана М.І. Галенчык адрэдагаваў 5-томны бібліяграфічны паказальнік "Навука і навукова-даследчая работа ў Беларусі" (1918–1973 гг.), дзе ў першым томе пабачыў свет яго ўводны артыкул "Развіццё навукі ў БССР" аб'ёмам 1,6 д. а. За выключэннем паказанага, ён апублікаваў артыкул у навуковым часопісе, дзве рэцэнзіі (у суаўтарстве), некалькі артыкулаў у Беларускай савецкай энцыклапедыі, падрыхтаваў буклет "Акадэмія навук БССР" (1 д.а.) [34, арк. 184а, 185].

Да пачатку 1977 г. значная праца, праведзеная аўтарскім калектывам, а ў яго ўвайшлі каля 50 вядомых вучоных АН БССР, у цэлым была скончаная. 28 сакавіка 1977 г. на паседжанні Вучонай рады Інстытута гісторыі адбылося абмеркаванне пяці раздзелаў манаграфіі. Кніга абмяркоўвалася не цалкам таму, што гістарычныя аспекты і сучасны стан прыродазнаўчых і дакладных навук выконваўся адпаведнымі спецыялістамі Акадэміі. Тым не менш, поўны варыянт тэксту шмат разоў апрабіраваўся ў аддзяленнях Акадэміі навук.

На зазначаным паседжанні станоўчую ацэнку У.А. Палуяна, І.Я. Марчанкі, Аляксандра Аляксандравіча Фактаровіча, З.М. Сарокі атрымалі раздзелы, што асвятлялі перад- і гісторыю ўстановы ў 1920-я – пачатку 1940-х гадоў; дзейнасць АН БССР у гады Вялікай Айчыннай вайны, развіццё гістарычнай навукі, аднаўленне і развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы, структуры і кадравага патэнцыялу, пытанні каардынацыі навуковых даследаванняў і пашырэння міжнародных сувязяў [35, арк. 144, 154, 155]. Праца была здадзеная ў БелСЭ на навуковае рэдагаванне, а 1 студзеня 1977 г. на чарговым паседжанні Вучонай рады канстатавалася заканчэнне падрыхтоўкі кнігі і было вырашана планавую тэму лічыць выкананай.

Але на гэтым дзейнасць групы не спынілася. Ёй праз шэсць месяцаў быў падрыхтаваны скарочаны папулярны варыянт фундаментальнай працы пад назвай "Академия наук БССР. Исторический очерк", рэкамендаваны да друку Вучонай радай Інстытута гісторыі 30 чэрвеня 1977 г.

Абодва выданні выдзяляліся на фоне адпаведнай тагачаснай навуковай літаратуры не толькі тым, што на сваіх старонках упершыню прадстаўлялі значны сістэматызаваны масіў інфармацыі пра дзейнасць АН БССР за перыяд яе існавання. Тут знайшлі адлюстраванне дасягненні вучоных у даваенныя гады, падчас Вялікай Айчыннай вайны. Асноўная ўвага нададзена дзейнасці ўстановы ў пасляваенны перыяд. Разгледжаны вынікі развіцця фізіка-матэматычных, біялагічных, хімічных, геалагічных і, як тады пісалі, грамадскіх навук. Прааналізаваны некаторыя аспекты сувязі навукі з вытворчасцю, яе ўплыў на паскарэнне навукова-тэхнічнага прагрэсу, каардынацыі навуковай дзейнасці, супрацоўніцтва вучоных Акадэміі з вучонымі рэгіёнаў СССР, замежных краін, выдавецкая дзейнасць і інш.

Важна адзначыць і той момант, што ўпершыню былі прапанаваны для публікацыі біяграфічныя даведкі пра акадэмікаў, членаў-карэспандэнтаў, ганаровых членаў Акадэміі, лаўрэатаў Ленінскай і Дзяржаўнай прэмій. Відавочна, у 1970-я гады іх спіс і біяграфіі аўтары і складальнікі не маглі прадставіць без купюр. Разумеючы двухсэнсоўнасць сітуацыі, што склалася, адзін з аўтараў прапаноўваў: "Лічу, што матэрыял пра выбары акадэмікаў у 30-я гады лепш не ўключаць" [35, арк. 214]. Гэтая пазіцыя была выпраўленая значна пазней у выніку грамадска-палітычных зменаў у 1990-я гады.

Пасля ўрачыстасцяў з нагоды 50-гадовага юбілею Акадэміі навук супрацоўнікі групы гісторыі навукі А.У. Лібезін і М.У. Токараў разам з памочнікам прэзідэнта АН БССР Антонам Антонавічам Вайкулем, таксама ўпершыню ў гісторыі ўстановы, падрыхтавалі адпаведны зборнік матэрыялаў (20 д.а., старшыня рэдкалегіі акадэмік М.А. Барысевіч, намеснік старшыні – член-карэспандэнт П.Ц. Петрыкаў). У ім змешчаны асноўныя дакументы і матэрыялы, што мелі дачыненне да святкавання 50-годдзя Акадэміі навук: пастанова ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР "Аб 50-годдзі Акадэміі навук Беларускай ССР", Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР "Аб узнагароджанні Акадэміі навук Беларускай ССР ордэнам Леніна", прывітанні ЦК КПБ, Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР і Савета Міністраў БССР,

прамова кандыдата ў члены Палітбюро ЦК КПСС, першага сакратара ЦК КПБ Пятра Міронавіча Машэрава, даклад прэзідэнта АН БССР Н.А. Барысевіча "50 гадоў Акадэміі навук БССР", выступленне прэзідэнта АН СССР Анатоля Пятровіча Аляксандрава, іншыя прывітанні. Пад адной вокладкай аб'яднаны і матэрыялы юбілейных сесій, праведзеных у аддзяленнях Акадэміі. Зборнік меркавалася выдаць у 1980 г., хаця ён выйшаў з друку крыху пазней, калі ўжо існаваў самастойны аддзел гісторыі навукі [1].

Выкананне дадзенай працы ініцыявала даследаванні гісторыі дзейнасці асобных акадэмічных устаноў і іх падраздзяленняў. Так, пабачылі свет брашура Б.І. Сцяпанава "Институту физики АН БССР – 25 лет" (Мінск, 1980), кніга "Физико-технический институт АН БССР: К 50-летию института" і інш.[2] [5; 6; 7; 22; 23].

Натуральна, звярнулі ўвагу на гісторыю сваёй установы і гісторыкі. Падчас падрыхтоўкі да 50-годдзя Акадэміі навук, у рэчышчы якой выконвалася праца па стварэнні яе гісторыі, новы дырэктар Інстытута гісторыі П.Ц. Петрыкаў у 1975 г. прапанаваў: "Набліжаецца юбілей нашай Акадэміі. Я думаю, што мы будзем у стане выдаць кнігу "Інстытут гісторыі АН БССР". Гэта павінна быць праца навукова-гістарычнага характару, у якой паказаны жыццё і дзейнасць інстытута за час яго існавання" [32, арк. 180]. Праз тры гады, 17 красавіка 1978 г., на паседжанне Вучонай рады інстытута з мэтай рэкамендацыі да друку была прадстаўленая брашура "Институт истории Академии наук Белорусской ССР". У абмеркаванні тэксту, які ўпершыню прысвячаўся выключна акадэмічнаму Інстытуту гісторыі, узялі ўдзел члены-карэспандэнты АН БССР П.Ц. Петрыкаў, К.І. Шабуня, Ніна Васільеўна Каменская, дактары навук А.Я. Залескі, Залман Юдавіч Капыскі, І.Я. Марчанка, Леанід Давыдавіч Побаль, кандыдат навук М.У. Токараў. У прамовах выступоўцаў рукапіс атрымаў станоўчую ацэнку і быў рэкамендаваны да друку. Тады ж прызначана і рэдкалегія ў складзе дырэктара інстытута П.Ц. Петрыкава і акадэміка Івана Сяргеевіча Краўчанкі. Праўда, дадзеная праца апублікаваная не была, а 50-гадовы юбілей аднаго з першых інстытутаў Акадэміі навук упершыню адзначаны толькі асобным артыкулам П.Ц. Петрыкава ў акадэмічным часопісе [21]. Праз дзесяць гадоў вучоным, тады ўжо толькі загадчыкам аддзела гісторыі навукі, ініцыявана чарговая спроба выдання брашуры да наступнага 60-гадовага юбілею інстытута. Даследчыкамі аддзела Г.У. Карзенкам, М.У. Токаравым, Л.П. Храпко, І.І. Шаўчуком і вучоным сакратаром інстытута Міхаілам Клаўдзіевічам Кошалевым былі падрыхтаваны тэксты, але сама брашура выйшла з друкарні толькі ў 1992 г. [8].

Вучонымі групы гісторыі навукі выконваліся і іншыя тэмы. Так, вышэй згадваўся ўдзел М.І. Галенчыка ў стварэнні 5-томнай "Гісторыі Беларускай ССР". Адным з членаў рэдкалегіі пятага тома з'яўляўся П.Ц. Петрыкаў. Ён жа быў суаўтарам першага раздзела дадзенага тома "Аднаўленне і развіццё народнай гаспадаркі. Культурнае будаўніцтва (1945–1958)", аўтарам сёмага

[2] Па просьбе дырэктара інстытута В.М. Чачына раздзел у гэтую юбілейную публікацыю дададзены да плана сектара гісторыі навукі. Выканаўца ад сектара гісторыі навукі – М.І. Галенчык.

раздзела “Курс на ўдасканаленне развітога сацыялізму і яго перарастанне ў камунізм. Пашырэнне ўдзелу працоўных у грамадска-палітычным жыцці”. У рамках падрыхтоўкі да 50-гадовага юбілею АН БССР П.Ц. Петрыкаў, Я.І. Калеснік, М.І. Галенчык узялі ўдзел у стварэнні пяцітомнага бібліяграфічнага паказальніка літаратуры “Наука и научно-исследовательская работа в Белоруссии (1918–1973 гг.)” (Мінск, 1975–1977). У першым томе М.І. Галенчыкам напісаны ўводны артыкул “Развитие науки в БССР” (с. 3–34, 2 д.а.) [13–17]. Ім жа падрыхтаваны буклет “Академия наук БССР” (1 д.а.) [3]. 30 чэрвеня 1978 г., пасля сакавіцкай рэкамендацыі да друку раздзелаў фундаментальнай працы па гісторыі АН БССР, што выконвалася супрацоўнікамі інстытута (раздзелы 1–3 – М.І. Галенчык; раздзел 4 – І.Я. Марчанка, раздзел 5 – П.Ц. Петрыкаў), Вучоная рада палічыла прыдатнай да публікацыі навукова-папулярную брашуру “Академия наук БССР. Исторический очерк” [2]. У 1979 г. двойчы абмяркоўвалася на паседжаннях Вучонай рады інстытута і таксама была рэкамендавана да друку праца Леаніда Міхайлавіча Лыча і М.І. Галенчыка “Роль белорусской науки в ускорении научно-технического прогресса на современном этапе”.

Супрацоўнікі групы і аддзела гісторыі навукі ўзялі актыўны ўдзел у распрацоўцы яшчэ адной важнай гісторыка-навуковай праблемы. На пачатку 1979 г. акадэмік М.А. Барысевіч прапанаваў М.І. Галенчыку падрыхтаваць манаграфію, прысвечаную Інстытуту беларускай культуры[3], да яго 60-годдзя, якое меркавалася адзначыць у 1982 г. 14 мая Прэзідыум падтрымаў хадайніцтва дырэктара Інстытута гісторыі П.Ц. Петрыкава пра распрацоўку праблемы і прыняў рашэнне аб напісанні кнігі “Інстытут беларускай культуры”. Яе рэдактарам зацверджаны М.А. Барысевіч, аўтарам – М.І. Галенчык[4]. Апошні прадставіў прэзідэнту АН БССР шэсць варыянтаў плана-праспекта тэмы, адзін з якіх 7 чэрвеня 1979 г. кіраўнік Акадэміі ўхваліў. За шэсць месяцаў аўтарам вывучалася наяўная літаратура, аналізаваліся публікацыі перыядычнага друку (“Звязда”, “Савецкая Беларусь”, “Наш край”, “Полымя”, “Бальшавік Беларусі”, “Вестник Наркомпроса ССРБ”, “Адраджэньне”). Вялася архіўная пошукавая работа па матэрыялах сесій ЦВК БССР, з’ездаў КП(б)Б. У ЦДАКР вывучаны фонды ЦВК і СНК, Наркамасветы, Наркамфіна БССР. Патрэбная інфармацыя выяўлялася ў архівах АН БССР і Інстытута гісторыі партыі. Да пачатку 1980 г. М.І. Галенчык роўналежна з азначанай дзейнасцю напісаў варыянт тэксту першага раздзелу аб’ёмам звыш двух аркушаў і цалкам падрыхтаваў дадаткі да кнігі. Але на паседжанні Вучонай рады Інстытута гісторыі 2 лютага прапанавана павялічыць склад аўтарскага калектыву адпаведнымі спецыялістамі, матывуючы рашэнне навуковым характарам выдання, а таксама сціслымі тэрмінамі выканання працы, якую неабходна здаць у выдавецтва да 1 лютага 1981 г. з тым, каб яна выйшла да юбілею ў 1982 г.

[3] Першая і апошняя на той час кніга, спецыяльна прысвечаная Інбелкульту, пабачыла свет яшчэ ў 1920-х гадах [9].

[4] У рэдакцыйную калегію манаграфіі ўвайшлі: акадэмікі АН БССР М.А. Барысевіч (старшыня), К.К. Атраховіч, Г.І. Гарэцкі, член-карэспандэнт П.Ц. Петрыкаў (намеснік старшыні), М.І. Галенчык (адказны сакратар выдання).

Прэзідыум Акадэміі навук пагадзіўся з пазіцыяй Інстытута гісторыі і 14 сакавіка пастанавіў павялічыць колькасць аўтараў. У сваю чаргу 29 красавіка былі ўстаноўлены планавыя заданні па напісанні тэкстаў для кнігі "Інстытут беларускай культуры" старэйшаму навуковаму супрацоўніку М.І. Галенчыку ў аб'ёме 4 а.л. (Раздзел І "Стварэнне Інстытута беларускай культуры" – 1,8 а.л., напісана 2 а.л.; параграфы "Сельскагаспадарчыя навукі", "Даследаванні ў галіне прыродазнаўчых навук" – 0,4 а.л. трэцяга раздзелу; раздзел IV "Дзейнасць сектараў і самастойных камісій Інбелкульта. Краязнаўства" – 1,8 а.л., напісана 2 а.л. [41, арк. 50]) і загадчыку сектара гісторыі феадалізму В.І. Мялешку (параграф "Гістарычная навука", уключаючы ў яго і археалогію, раздзела II "Развіццё грамадскіх навук" аб'ёмам 1 а.л.). Аўтары абавязваліся здаць напісанае ў дырэкцыю да 25 снежня 1980 г. Прэзідыумам вызначаліся агульны аб'ём кнігі і тэрміны выканання планавага задання – адпаведна 10–12 а.л. і І квартал 1980 г. – IV квартал 1981 г. [38, арк. 85; 39, арк. 65, 69; 40, арк. 46]. Да снежня 1981 г. выканаўцы напісалі больш за 15 д.а. тэкстаў. Упершыню ў беларускім, амаль незаўважным у тыя часы, навуказнаўстве на падставе архіўных крыніц сістэматычна прадстаўлена арганізацыйнае станаўленне сацыяльнага інстытуту навукі ў Беларусі ў 1920-я гады, развіццё яго асобных галін: гісторыі, мова- і літаратуразнаўства, філасофіі, прыродазнаўства, правазнаўства, сельскагаспадарчых навук і інш. Тады ж ажыццёўлена навуковае рэдагаванне тэкстаў і дапрацоўка аўтарамі матэрыялаў па заўвагах рэдактараў.

Улічваючы зробленае супрацоўнікамі групы, а таксама патрэбы далейшага развіцця навукі рэспублікі, бюро Прэзідыуму АН БССР 10 красавіка 1980 г. пастанавіла стварыць на базе групы па вывучэнні гісторыі навукі сектар гісторыі навукі[5] з 1 чэрвеня (адпаведны інстытуцкі загад датуецца 11 красавіка; падставай для гэтых захадаў стала пастанова Вучонай рады Інстытута гісторыі 22 лютага 1980 г.). Пры аддзеле прадугледжвалася функцыянаванне групы па арганізацыі музея Акадэміі. У першы склад сектара ўвайшлі, за выключэннем кіраўніка дырэктара інстытута П.Ц. Петрыкава (заняў гэтую пасаду на грамадскіх пачатках), старшыя навуковыя супрацоўнікі М.І. Галенчык, Мікалай Львовіч Іваноў, Аляксей Савельевіч Харэбін, малодшы навуковы супрацоўнік М.У. Токараў, лабаранты Л.У. Калядзінская, Андрэй Леанідавіч Кіштымаў і Рэгіна Станіславаўна Ерашкевіч.

На працягу 1970-х гадоў у акадэмічным Інстытуце гісторыі, такім чынам, былі закладзеныя арганізацыйныя падмуркі гісторыка-навуковых і навуказнаўчых даследаванняў. Дзейнасць групы па вывучэнні гісторыі навукі ў значнай ступені ініцыявала навуковыя пошукі кіраўнікоў і супрацоўнікаў іншых

---

[5] У рэчышчы выканання пастановы ЦК КПСС, СМ СССР і УЦСПС "О совершенствовании оплаты труда научных работников, конструкторов и технологов промышленности" (22 мая 1985 г.), у адпаведнасці з распараджэннем Прэзідыума АН БССР "О совершенствовании оплаты труда научных работников, конструкторов и технологов научно-исследовательских учреждений и конструкторских организаций АН БССР" (5 чэрвеня 1985 г.) у Інстытуце гісторыі адбыліся некаторыя структурныя змены. У прыватнасці, загадам па інстытуце 15 ліпеня 1986 г. сектары рэарганізаваныя ў аддзелы. Таксама ўводзіліся і новыя пасады: загадчык аддзела, вядучы навуковы супрацоўнік і навуковы супрацоўнік.

навуковых інстытуцый у 1970-я гады. Яна ж стварыла ўмовы паспяховай працы калектыву сектара (аддзела) гісторыі навукі, арганізаванага ў 1980 г. на базе групы. У выніку ў гэтым дзесяцігоддзі адбываўся актыўны працэс кадравага развіцця (за 9 гадоў абаронена адна доктарская і сем кандыдацкіх дысертацый), распрацоўкі новых актуальных праблем. Аднак адсутнасць шырокага навуковага кругагляду ў новага кіраўніцтва інстытута, яго гіпертрафіраваная, што да перспектыўных напрамкаў развіцця навукі, ганарлівасць, ненавуковае разуменне міжасабовых дачыненняў у навуцы, дазволілі яму ліквідаваць аддзел гісторыі навукі ў 1991 г. Гэта, зразумела, не ліквідавала, але звузіла і запаволіла на дзесяцігоддзі шырокія сістэматычныя інстытуцыянальныя даследаванні адпаведнай тэматыкі ў Беларусі, нягледзячы на аднаўленне аддзела ў 1999 г.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. 50 лет Академии наук БССР: Документы, материалы юбилейных торжеств / сост.: А.А. Вайкуль, О.В. Либезин, Н.В. Токарев ; редкол.: Н.А. Борисевич [и др.]. – Минск : Наука и техника, 1981. – 248 с.

2. Академия наук Белорусской ССР / сост.: П.Т. Петриков, Н.В. Токарев, О.В. Либезин ; науч. ред. Н.А. Борисевич. – Минск : Наука и техника, 1979. – 151 с.

3. Галенчик, Н.И. Белорусская ССР: Наука / Н.И. Галенчик. – Минск : Беларусь, 1977. – 31 с.

4. Гращенков, Н.И. Академия наук Белорусской ССР / Н.И. Гращенков // Академии наук союзных республик. К тридцатилетию Великой Октябрьской социалистической революции. – М. ; Л., 1947. – С. 35–72.

5. Грибковский, В.П. Академии наук БССР – 50 лет / В.П. Грибковский. – Минск : Знание, 1979. – 22 с.

6. Грибковский, В.П. Очерк научной деятельности лаборатории оптики полупроводников за 25 лет (1971–1996) / В.П. Грибковский. – Минск : ИФ АНБ, 1997. – 37 с.

7. Грибковский, В.П. Развитие сотрудничества АН БССР с отраслевыми научными учреждениями / В.П. Грибковский. – Минск, 1981. – 27 с.

8. Институт истории Академии наук Беларуси : краткий очерк / Г.В. Корзенко [и др.] ; под ред. М.П. Костюка. – Минск : Наука и техника, 1992. – 79 с.

9. Інстытут Беларускае Культуры (Інбелкульт). Гісторыя ўзьнікненьня. Сучасная структура. Навукова-дасьледчая дзейнасьць / апрацаваў А.І. Цьвікевіч. – Менск : ДВБ, 1926. – 118 с.

10. Купревич, В.Ф. Академия наук Белорусской ССР. Исторический очерк / В.Ф. Купревич. – Минск : Изд-во АН БССР, 1957. – 152 с.

11. Купрэвіч, В.Ф. Акадэмія навук Беларускай ССР. Нарыс гісторыі і дзейнасці / В.Ф. Купрэвіч. – 2-е дап. выд. – Мінск : Выд-ва АН БССР, 1958. – 276 с.

12. Купревич, В.Ф. Академия наук Белорусской ССР. Очерк истории и деятельности / В.Ф. Купревич. – 3-е доп. изд. – Минск : Наука и техника, 1968. – 240 с.

13. Наука и научно-исследовательская работа в Белоруссии (1918–1973 гг.) : библиографический указатель литературы : в 5 т. / сост.: А.Д. Василевская, Н.Е. Виталева ; авт. пред. Н.И. Галенчик. – Минск : Наука и техника, 1975–1977. – Т. 1 : Развитие науки. История, состояние и задачи отдельных отраслей. – 1975. – 322 с.

14. Наука и научно-исследовательская работа в Белоруссии (1918–1973 гг.) : библиографический указатель литературы : в 5 т. / сост.: А.Д. Василевская,

Н.Е. Виталева ; авт. пред. Н.И. Галенчик. – Минск : Наука и техника, 1975–1977. – Т 2 : Научные учреждения и общества Белоруссии. – 1976. – 373 с.

15. Наука и научно-исследовательская работа в Белоруссии (1918–1973 гг.) : библиографический указатель литературы : в 5 т. / сост.: А.Д. Василевская, Н.Е. Виталева ; авт. пред. Н.И. Галенчик. – Минск : Наука и техника, 1975–1977. – Т. 3 : Высшие учебные заведения Белоруссии. – 1976. – 238 с. ; Т. 4 : Персоналия. – 1977. – 260 с.

16. Наука и научно-исследовательская работа в Белоруссии (1918–1973 гг.) : библиографический указатель литературы : в 5 т. / Академия наук Белорусской ССР, Фундаментальная библиотека им. Я. Коласа ; сост.: А.Д. Василевская, Н.Е. Виталева ; авт. пред. Н.И. Галенчик. – Минск : Наука и техника, 1975–1977. – Т. 5 : Вспомогательные указатели. – 1978. – 293 с.

17. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Фонд 4п. – Воп. 1. – Спр. 4127. – Постановление секретариата ЦК КП(б)Б, протоколы заседаний фракций КП(б)Б Белорусской сельскохозяйственной академии, Белорусского бюро пролетарского студенчества при ЦСПСБ, совещания научных работников медицинского факультета Белгосуниверситета, планы работы Главнауки Наркомпроса БССР на январь – сентябрь 1928 г., Центрального бюро пролетарского студенчества на сентябрь 1928 г. – январь 1929 г., тезисы о научно-исследовательской работе в БССР. 17 августа 1928 г. – 16 октября 1929 г.

18. Няміга, Г. Інстытут беларускай культуры – Беларуская Акадэмія навук – Акадэмія навук Беларускай ССР / Г. Няміга. – Мюнхен, 1957. – 162 с.

19. Палуян, У.А. Інстытут беларускай культуры і станаўленне беларускай савецкай навукі / У.А. Палуян // Весці АН БССР. – Сер. грамад. навук. – 1972. – № 6. С. 104–111.

20. Петриков, П.Т. Академия наук Белорусской ССР / П.Т. Петриков, Н.В. Токарев, О.В. Либезин. – Минск : Наука и техника, 1979. – 151 с.

21. Петрыкаў, П.Ц. Інстытуту гісторыі АН БССР 50 гадоў / П.Ц. Петрыкаў // Весці АН БССР. – Сер. грамад. навук. – 1979. – № 6.

22. Степанов, Б.И. Институту физики АН БССР – 25 лет / Б.И. Степанов. – Минск : Институт физики АН БССР, 1980. – 45 с.

23. Физико-технический институт АН БССР : К 50-летию института / Н.И. Галенчик, Н.Ф. Клебанович, Ж.А. Мрочек [и др.] ; редкол.: В.Н. Чачин (пред.) [и др.]. – Минск : Наука и техника, 1981. – 192 с.

24. Цэнтральны навуковы архіў НАН Беларусі (ЦНА НАНБ). – Фонд 1. – Спр. 2. Протоколы заседаний Президиума АН БССР. 1929 г.

25. ЦНА НАНБ. – Фонд 3. – Спр. 673. Приказы по Институту истории АН БССР. 5 января – 9 июля 1973 г.

26. ЦНА НАНБ. – Фонд 3. – Спр. 674. Приказы и распоряжения по Институту истории АН БССР. 9 июля – 24 декабря 1973 г.

27. ЦНА НАНБ. – Фонд 3. – Спр. 675. Протоколы заседаний Учёного совета Института истории АН БССР и материалы к ним. 29 января – 15 сентября 1973 г.

28. ЦНА НАНБ. – Фонд 3. – Спр. 676. Протоколы Учёного Совета Института истории. 8 октября – 29 декабря 1973 г.

29. ЦНА НАНБ. – Фонд 3. – Спр. 681. Приказы по Институту истории АН БССР. Январь – июль 1974 г.

30. ЦНА НАНБ. – Фонд 3. – Спр. 684. Протоколы Учёного Совета Института истории. 1974 г.

31. ЦНА НАНБ. – Фонд 3. – Спр. 689. Приказы по институту за 1975 г.

32. ЦНА НАНБ. – Фонд 3. – Спр. 691. Протоколы Учёного Совета Института [истории]. 1975 г.
33. ЦНА НАНБ. – Фонд 3. – Спр. 701. Протоколы Учёного Совета Института [истории]. 1976 г.
34. ЦНА НАНБ. – Фонд 3. – Спр. 703. Протоколы Учёного Совета Института [истории]. 1976 г.
35. ЦНА НАНБ. – Фонд 3. – Спр. 712. Протоколы Учёного Совета Института [истории]. 1977 г.
36. ЦНА НАНБ. – Фонд 3. – Спр. 722. Протоколы Учёного Совета Института [истории]. 1978 г.
37. ЦНА НАНБ. – Фонд 3. – Спр. 731. Годовой отчёт о научно-исследовательской работе института [истории] за 1974 г.
38. ЦНА НАНБ. – Фонд 3. – Спр. 755. Приказы по иистituту за 1980 г.
39. ЦНА НАНБ. – Фонд 3. – Спр. 758. Протоколы заседаний Учёного Совета Института [истории] и матерналы к иим за 1980 г.
40. ЦНА НАНБ. – Фонд 3. – Спр. 760. Протоколы заседаний Учёного Совета Института [истории] и материалы к ним за 1980 г.
41. ЦНА НАНБ. – Фонд 3. – Спр. 762. Протоколы заседаний Учёного Совета Иистиtута [истории] и материалы к ним за 1980 г.
42. ЦНА НАНБ. – Фонд 3. – Спр. 359. Протоколы заседаний бюро Отделения общественных наук АН БССР. 1972 г.
43.Шпилевский, И.Ф. Белорусская Академия наук на пороге второй пятилетки : ист. очерк / И.Ф. Шпилевский, Л.А. Бобрович. – Минск, 1933. – 112 с.
44. Шпілеўскі, І.Ф. Беларуская Акадэмія навук да XV-годдзя БССР / І.Ф. Шпілеўскі. – Менск : Выд-ва БАН, 1934. – 144 с.
45. Шчарбакоў, В. Праблема навуковых кадраў у БССР / В. Шчарбакоў // Савецкая краіна. – 1931. – № 1. – С. 33–41.
46. Шчарбакоў, В.К. Навуковая дзейнасць Беларускай акадэміі навук у 1935 г. і задачы 1936 г. / В.К. Шчарбакоў // Запіскі Беларус. акад. навук. – 1935. – Кн. 5. – С. 192–209.

УДК 2.27.314

**Акиничц И.И.**, доктор философских наук, профессор кафедры философии и культурологии
Беларусь, Брест, Брестский государственный технический университет

## У ИСТОКОВ ИССЛЕДОВАИИЯ ПОЛЕССКИХ ВЕРОВАНИЙ

Расположение Полесья на стыке проживания трех восточнославянских народов и поляков во многом обусловило здесь интенсивность межэтнических связей и в то же время способствовало сохранению многих элементов и форм традиционной народной культуры полешуков, в том числе их религиозных верований. Одним из первых исследователей этих верований был Зориан Доленга-Ходаковский (Адам Чарноцкий, 1784–1825), человек удивительной судьбы. Он родился в имении известного в Беларуси рода Чарноцких, которое